## ХОДЗЯЦЬ ЧУТКІ, ШТО...

# ...НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА ПЕРАЯЗДЖАЕ Ў ДРАЖНЮ

Аб заняпадзе галоўнай скарбніцы беларускай культуры — Нацыянальнай бібліятэкі — было сказана ў апошні час нямала слоў. І хоць пра ўзвядзенне новага будынка ў мікрараёне «Усход» ніхто ўжо не ўспамінае, але напрыканцы мінулага года дзяржава ўсё ж такі праявіла клопат: паабяцала правесці капітальны рамонт галоўнага будынка «Ленінкі» па вуліцы Чырвонаармейскай. Нагадаем, што пачынаючы з 1932 года, г. зн. з моманту яго будаўніцтва, не былo ніводнага рамонту. Куды пераедзе на гэты час са сваімі сямімільённымі фондамі Нацыянальная бібліятэка для яе чытачоў (а іх каля 37 тысяч), згадзіцеся, немалаважна. Адна справа — яе месцазнаходжанне ў самым цэнтры сталіцы і студэнцкага жыцця, другая — у Дражні — аддаленым і малапрывабным для язды на транспарце раёне. А менавіта гэтае месца, як кажуць, і вызначылі ўлады для часовага размяшчэння бібліятэкі.

Каб высветліць усе абставіны гэтай справы, «Звязда» звярнулася непасрэдна да кіраўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі. Як там паведамілі, пакуль «ленінцы» быў прапанаваны адзіны варыянт — будынак у раёне Дражні, але ніякага канчатковага рашэння яшчэ не прынята. З упэўненасцю сёння можна сказаць толькі адно: незалежна ад таго, якім яно будзе, чытачы пацярпець не павінны. Капітальны рамонт адразу ўвесь будынак не ахопіць, таму кнігі будуць пакідаць кнігасховішча паэтапна, а потым вяртацца назад. Чытальная ж зала застанецца на ранейшым месцы. А вось рукапісы, унікальныя выданні Францыска Скарыны, Івана Фёдарава, Пятра Мсціслаўца і інш. увогуле галоўны корпус не пакінуць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**